■ Экслібрыс «Звязды»

# ДАЛУЧЫЦЦА ДА ЛЁСУ ТВОРЦЫ

**Рыгор Барадулін. Дзённікі і запісы. Выпуск 1. 1951 — 1969. / укл., прадм. Н. Давыдзенка. — Мінск: Кнігазбор, 2015. — 328 с.**




Можна доўга разважаць і нават спрачацца пра тое, ці варта чытаць чужыя дзённікі. Нехта скажа, што гэта надта інтымная і індывідуальная рэч, нават зазірнуць у дзённік — злачынства. А хтосьці наадварот будзе з цікавасцю зачытвацца прызнаннямі на паперы, вышукваючы сакрэты і таямніцы. Але дзённікі, напісаныя вядомымі аўтарамі і апублікаваныя ў кнігах ці часопісах, — зусім іншая справа. З аднаго боку, яны ствараліся не дзеля захавання таямніц, а дзеля памяці пра важныя (і не зусім) падзеі жыцця, з іншага — менавіта такія нататкі дазваляюць прасачыць развіццё творчай індывідуальнасці аўтара, пабачыць яго у новым ракурсе. Ды і чытач, які знаёміцца з дзённікам любімага пісьменніка, можа адчуць далучанасць да лёсу творцы, перажыць разам з ім радасныя і сумныя моманты жыцця. Зрэшты, чытаць нататкі вядомых людзей — проста прыемна і цікава.

Кніга дзённікавых запісаў і нататак народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна — менавіта з такой кагорты. Яна цікавая і смешная, поўная клопатаў і перажыванняў, радасці ад публікацый і суму з прычыны кепскіх адзнак у школе і ва ўніверсітэце. У выданне ўвайшлі дзённікі, кароткія рабочыя заметкі, паэтычныя накіды і ўражанні ад шматлікіх паездак. Усе дакументы, што склалі аснову кнігі, датуюцца 1951—1969 гадамі. Перад вачыма чытача мільгае жыццё Барадуліна-васьмікласніка (яго школьны дзённічак, напісаны па-руску і датаваны 1951 годам, быў цудам адшуканы), студэнта першага і другога курсаў філфака БДУ, працаўніка на цаліне (1955—1956). Са старонак гэтага выдання чытачы змогуць даведацца пра ўражанні ад першай замежнай паездкі Барадуліна ў Польшчу (1958), а таксама многіх і многіх падарожжаў па гарадах Беларусі, у Эстонію, Краснаярскі край, Туву, Хакасію, Латвію, Далёкі Усход, Крым, Азербайджан, Узбекістан і, натуральна, родную Ушаччыну, куды паэт заўсёды вяртаўся з асаблівай радасцю.

Які быў Барадулін у маладосці? Калі ён вучыўся ў восьмым класе, не вылучаўся прыкладнымі паводзінамі, часта атрымліваў заўвагі ад настаўнікаў. Не надта любіў анатомію, затое нямецкая мова, геаграфія, беларуская, руская мовы і літаратуры былі ў яго ў ліку любімых прадметаў. Васьмікласнік Рыгор зачытваўся кнігамі, бавіў шмат часу з сябрамі і ўжо пачынаў звяртаць увагу на прыгожых дзяўчат. Ён не надта старанна рыхтаваўся да ўрокаў, сачыненні пісаў хутка, меў выдатнае пачуццё гумару, час ад часу пісаў вершы.

Барадулін-студэнт таксама любіў чытаць, бавіць час з сябрамі, хадзіць у кіно. Мы разам з аўтарам дзённіка адчуваем радасць ад першай публікацыі верша ў «Чырвонай змене», наведваем пісьменніцкія сходы, ходзім на лекцыі, перажываем за маці, якая засталася зусім адна ў вёсцы і, хоць сама не так многа мае, дасылае пасылкі сыну. Мы губляем грошы, хвалюемся за памер стыпендыі, рыхтуемся да экзаменаў і п'ём віно з сябрамі. Разам з Барадуліным чытач перажывае і яго першае каханне да аднакурсніцы Ані. Тут паэт паказвае сябе не толькі як уражлівы закаханы юнак, які жыве адно сваім пачуццём, але і як мудры чалавек.

Са старонак дзённіка паэта можна даведацца пра яго ўражанні ад працы на цаліне, пабачыць побыт студэнтаўцалінніікаў, прачытаць пра паездку праз усю Расію на цягніку і нават дазнацца пра тое, што Барадулін аднойчы ледзь не загінуў пад коламі грузавіка. Героямі дзённіка становяцца сябры і аднакурснікі паэта, імёны многіх з іх чытач пазнае, бо сёння і яны з'яўляюцца вядомымі пісьменнікамі, перакладчыкамі, акцёрамі.

Адметна, што ў кнізе прадстаўлены не толькі цэльныя дзённікавыя запісы (аўтар то піша іх штодзень, занатоўваючы нават неістотныя падзеі, то «закідвае» гэтую справу на некалькі месяцаў, а потым прыводзіць справаздачу пра самае важнае, што адбылося за час маўчання), але і шматлікія раскіданыя заметкі і нататкі, зробленыя паэтам «на хаду». На старонках кнігі чытач пазнаёміцца і з невядомымі вершамі Рыгора Барадуліна, іх паэт не ўключаў у свае зборнікі. Таксама тут прадстаўлена і самая першая паэма творцы «Зацвітаюць купавы» (1958—1959), прысвечаная лёсу маці і бацькі паэта. Пра гэты твор сам Рыгор Іванавіч ніколі не згадваў.

Гэта толькі першы выпуск дзённікаў паэта. Спадзяюся, хутка пабачаць свет і запісы Рыгора Барадуліна, зробленыя пасля 1969 года, дзе можна будзе далей прасачыць развіццё таленту і сталенне творчай думкі Майстра, прачытаць пра цікавыя падзеі, што адбываліся ў яго жыцці.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.49 | 21.40 | 16.51 |
| Віцебск — | 4.31 | 21.37 | 17.06 |
| Магілёў — | 4.39 | 21.30 | 16.51 |
| Гомель — | 4.45 | 21.18 | 16.33 |
| Гродна — | 5.06 | 21.53 | 16.47 |
| Брэст — | 5.16 | 21.45 | 16.29 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 8 ліпеня. Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**

*Пр. Георгія, Давыда, Дзяніса, Івана.*
*К. Веранікі, Зянона, Мікалая.*



Фота Івана КУПАРВАСА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**9 ЛІПЕНЯ**

**1868** год — на арандаванай зямлі ў Ворпл-Роад, на паўднёвым захадзе Лондана, быў створаны «Усеанглійскі кракет-клуб». У 1872 годзе нехта Джон Уолш, каб запісаць сваю дачку ў пажыццёвыя члены клуба, падарыў яму машынку для стрыжкі газонаў. Акрамя кракета, гульцы таксама захапляліся лаўн-тэнісам. Неўзабаве папулярнасць гэтай гульні ўзрасла настолькі, што давялося пабудаваць у 1875 годзе першы тэнісны корт і ўвесці тэніс у назву клуба. Аднак нечакана адбылося няшчасце: зламалася газонакасілка, і спартсмены ўжо не маглі сабе дазволіць гуляць у любімыя гульні, паколькі корт вельмі хутка зарастаў травой. Новая газонакасілка каштавала 10 фунтаў. Па тых часах гэта былі вялікія грошы, а клуб такіх сродкаў не меў. І тады камусьці ў галаву прыйшла думка правесці спаборніцтвы і такім чынам зарабіць на новую газонакасілку. У пачатку ліпеня 1877 года чытачы газеты «The Field» прачыталі наступную аб'яву: «Усеанглійскі кракетны і лаўн-тэнісны клуб «Уімблдон» прапануе ўсім ахвотным паспрабаваць свае сілы ў тэнісным спаборніцтве ў панядзелак, 9 ліпеня, а таксама ў наступныя дні. Пераможцаў чакаюць два прызы: залаты прыз — чэмпіёну, а сярэбраны — фіналісту!» З надзеяй атрымаць галоўны прыз 22 гульцы не паскупіліся заплаціць арганізатарам узнос па адной гінеі кожны ў якасці платы за ўдзел у турніры. Галоўны прыз (35 гінеяў) дастаўся Спенсеру Гору — першаму чэмпіёну Уімблдона, які па заканчэнні фінальнага матча заявіў: «Тэніс — вельмі складаная гульня, і я не ўпэўнены, ці зможа яна стаць сапраўды папулярнай». Па выніках правядзення турніру і выплаты падаткаў у касе засталося 17 гінеяў — гэта было нашмат больш, чым каштавала машынка. З таго часу спаборніцтва на кортах «Усеанглійскага кракетнага і лаўн-тэніснага клуба» стала традыцыйным, і сёння Уімблдонскі турнір з'яўляецца адным з найбуйнейшых тэнісных турніраў свету. Сёлета яго прызавы фонд склаў 26,75 млн фунтаў стэрлінгаў — больш за 37 мільёнаў долараў.



**1948** год — нарадзіўся (г. Мінск) Янчэўскі Вячаслаў Іванавіч, матэматык. Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Скончыў з адзнакай Белдзяржуніверсітэт (1971). З 1974 года працуе ў Інстытуце матэматыкі НАН Беларусі. Навуковыя працы ў галіне алгебры, алгебраічнай геаметрыі і алгебраічнай К-тэорыі. Прэмія НАН Беларусі 2008 года за даследаванне структурных уласцівасцей алгебраічных мнагастайнасцей. Аўтар больш за 200 навуковых прац.

**1957** год — 60 гадоў таму 11 сусветна вядомых навукоўцаў, у тым ліку А. Эйнштэйн, Ф. Жаліо-Кюры, Б. Расэл, падпісалі заклік за раззбраенне, прадухіленне тэрмаядзернай вайны і навуковае супрацоўніцтва («Маніфест Эйнштэйна-Расэла»), які паклаў пачатак так званаму Пагуошскаму руху вучоных.

**Было сказана**

**Віктар ГАРДЗЕЙ, паэт:**

*Не знішчым мы, не страцім,*
*Не згубім*
*Сваіх азёр, лугоў, сваіх лясоў*
*І родны край і мову не разлюбім.*

■ Здарэнне

### У «СЕТКІ» ІНСПЕКТАРАЎ ТРАПІЎ... НАРКАМАН

**У Заводскім раёне сталіцы дзяржінспектары аховы жывёльнага і раслiннага свету затрымалі... наркамана.**

Падчас начнога рэйду супрацоўнікі Мінскай міжрайінспекцыі звярнулі ўвагу на падазроны аўтамабіль, прыпаркаваны ў прыбярэжнай зоне. Побач знаходзіўся чалавек, які трымаў у руках прыстасаванне для курэння і піпетку з цёмным рэчывам. Адзін з інспектараў, які раней працаваў у органах наркакантролю, западозрыў, што мужчына ўжывае наркотыкі. А той і не адмаўляў, што трымае ў руках мікс для курэння. 31-гадовы мінчанін распавёў, што заказаў наркотыкі па інтэрнэце. Пасля аплаты праз электронную сістэму разлікаў яму паведамілі месца, дзе ў тайніку была схаваная сумесь. Праведзеная экспертыза паказала, што рэчыва з піпеткі — небяспечны псіхатроп. Заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*sr@zviazda.by*

**Шаноўны Аляксандр Іванавіч ЗАЗУЛЯ!**

Вам — усяго 50! Няхай гэты памятны юбілей стане яркай зоркай у вашым жыцці. Як кіраўніку нашага Кобрынскага раёна жадаем Вам новых працоўных перамог, яшчэ больш важкіх ураджаяў на роднай ніве, прыемных перамен у сацыяльнай сферы, упэўненасці ў заўтрашнім дні разам з усімі намі.

*Адміністрацыя*
*КСУП «Плямянны завод «Дружба».*

## УСМІХНЕМСЯ

Пасля таго, як у жанчыны з'яўляецца муж, яна, нарэшце, разумее, хто ва ўсім вінаваты ў гэтым жыцці.

— Мой кот навучыў мяне адной жыццёвай мудрасці.
— Якой?
— Адзежу заўсёды трэба падбіраць пад колер яго поўсці.

**На 9-м месяцы цяжарнасці папрасіла мужа нафарбаваць пазногці на нагах. Доўга бурчаў, аднекваўся, маўляў, не мужчынская гэта справа. Пакрыўдзілася, пайшла мыцца. Выходжу: сядзіць фарбуе САБЕ пазногці і бубніць: «Чаго толькі вам, цяжарным, у галаву не заляціць...»**

**На дарозе цяпер такая анархія, страшна правы купляць!**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.183. Індэкс 63850. Зак. № 2747.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 ліпеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12